Американская исследовательница Джудит Лорбер утверждает, что необходимо построение нового социального порядка, потому что социальный порядок, существующий в настоящее время, пронизан гендерными отношениями и базируется на них. Социальный порядок будущего должен быть основан на принципе гендерного равенства и потому предстает в воображении конструктивистов как до некоторой степени безгендерный. Это не означает, что будущий (утопический) социальный мир не будет знать различий между мужчинами и женщинами. Это значит, что различия, в том числе и между полами, перестанут реализовываться как иерархические, предполагающие не только разный статус, но и разные возможности.

**Литература**

1. *Gennifer H.* The Oxford Companion to Philosophy. Oxford, 1995.
2. Современная мировая историческая наука: Информационно-аналитический обзор (по материалам 18-го Международного конгресса историков, Монреаль, 1995). Мн., 1996.
3. *Синельников А.* В ожидании референта: маскулинность, фемининость и политики гендерных репрезентаций // Женщина, культура, гендер. М., 1999.
4. *Бовуар С.–де.* Второй пол. Т.1 и 2. М.; СПб., 1997.

## ЦЕЛА – НАЧЫННЕ БОСКАГА (ПУНКТЫ ГЛЕДЖАННЯ ТАНТРЫЗМУ І ХРЫСЦІЯНСТВА)

**Н. В. Гаўрыленка**

Прынцып любой рэлігіі – у падкрэсленні адносін цэлага да нечага «больш значнага». Цела – брудны недасканалы інструмент, што падлягае гвалтоўнаму абмежаванню, ці цела – праява Боскай свядомасці, сама свядомасць, раўнапраўная частка сусвету, якая мае законнае права выбару. Але фактычна, калі хрысціяне кажуць пра свабоду выбару, то маюць на ўвазе наяўнасць такой свабоды менавіта ў цела (а не ў душы ці духу).

Такім чынам, бачна, што, калі зірнуць глыбей, хрысціянства і тантрызм не да канца супярэчаць адно аднаму. У хрысціяніна і тантрыка як цялесных істот ёсць адзін і той жа выбар: падтрымліваць далей сваю адасобленасць і такім чынам працягваць гульню ў пакуты і радасці вярнуцца да адзінства, цэласнасці. Калі целу надакучвае гульня, вырашае, што прыйшоў час уз'яднання, яно выбірае шлях веры, даверу, адкрытасці. Сутнасць гэтага шляху аднолькавая для тантрызму і хрысціянства: цела аддае сябе, робячыся начыннем Боскага.

Тантра лічыць жаданне першаснай рухаючай сілай сусвету. Яна не заклікае адмовіцца ад жаданняў, бо гэта значыць ісці супраць усеагуль-

нага закону, знішчаючы сябе і разбураючы гармонію свету. Прыхільнікі іншых вучэнняў спрабуюць выкараніць жаданні шляхам аскезы. Але акрамя ўсяго іншага адсюль вынікае парадокс: каб выкараніць жаданні, трэба мець вялізнае жаданне гэта зрабіць. Не дзіўна, што будызм (у некаторых варыянтах) зрабіў такі моцны крэн у бок тантрычнага падыходу: тантрызм дазваляе вызваліцца, захоўваючы павагу да свайго цела, любячы яго, не гвалтуючы яго. Як жа ў такім выпадку можна атрымаць кантроль над жаданнямі і заганамі, што перашкаджаюць быць вольнымі, і целам як іх носьбітам? Для гэтага трэба ажыццявіць майтхуну садхану са сваім целам. Трэба спалучыць свядомасць з целам, пачаць яго ўсведамляць. Усведамленне сімвалізуецца як сексуальнае пранікненне і зліццё (майтхуна) з кожнай клеткай.

Трэба аддаць сваё цела для напаўнення свядомасцю. Аддаючыся, прынцып – цела (часткай якога з’яўляецца і розум – інструмент свядомасці, абмежаваны і абмяжоўваючы) – твор і праява Багіні Маці. Індыйская тантрычная традыцыя лічыць, што вызваленне як спалучэння з чыстай свядомасцю можна дасягнуць выключна з яе, Дэві Шакці, дапамогай. Гэта Дэві ажыццяўляе выбар і вядзе да спалучэння. Цела вырашае і ідзе да вызвалення, аддаючыся пад уладу свядомасці добраахвотна. Вызваленне можна дасягнуць, аддаючы сваё цела свядомасці, давяраючы ёй, верачы. Гэта падстава ўсёй тантрычнай практыкі. У тантраяне (будыйская тантра) шлях да вызвалення ляжыць праз шун’яту. Пераклад шун’яты як пустэчы, беззмястоўнасці можа ўводзіць у зман. У бытавой мове, калі ў шклянцы няма вады, – гэта шун’я, але гэта зусім не значэнне шун’яты ў будыйскай філасофіі. Шун’ята – высокастаноўчы тэрмін. Яна прыходзіць разам з адкрытасцю насустрач свету, калі мы ўспрымаем рэчы як самакаштоўнасць, без сувязі з намі, не як сродкі ці пагрозу. Шун’ята – гэта адкрытае вымярэнне Быцця, што дасягаецца ўсведамленнем, што больш не трэба сябе абараняць ні ад чаго і ні ад каго. Можна адпусціць сябе, аддаць сябе з даверам: свету, людзям, падзеям досведу. Гэта абсалютная свабода ад усяго і як вынік абсалютная смеласць. Тут таксама трэба дазволіць свядомасці вызваліць цела ад страху перад светам, розум павінен аддаць сябе і рэшту цела поўнасцю ва ўладу чыстай свядомасці. І верыць. Такі давер-вера вядзе да спалучэння Вышэйшым, якое не мае межаў ні ў выглядзе жаданняў, ні ведаў, ні страху за жыццё. Вера вызваляе ад жаданняў і выпраўляе заганы. А ці ж гэта нічога не нагадвае?

«Адпускаюцца табе грахі… Вера твая выратавала цябе» (Лука VII; 48, 50). Для хрысціяніна вера таксама значыць абсалютную адсутнасць страху. Вера заўсёды папярэджваецца свабодай (у хрысціянстве – свабодай выбару). Яна не прыходзіць як непасрэдны вынік страху. Паміж страхам і верай ёсць яшчэ адна прыступка: бунт, вызваленне ад усяго, што звязвае, нават прыгатаванасць да разрыву папярэдняй традыцыяй. Бунт супраць усіх абмежаванняў. У тым ліку граху як паняцця. Апокрыф «Евангелле ад святой Марыі Магдаліны» кажа: «Ідзі і не грашы больш, думаючы, што ты грашыш». Каб прыйсці да веры, трэба спаліць, адмовіць, знішчыць грэх. Але не як з'яву, а як паняцце. Трэба паверыць, што граху не існуе, у прыватнасці, ва мне, – толькі тады я годная стаць начыннем Боскай любові. Гэта і ёсць вера – адмаўленне сваёй грэшнасці. А стаўшы такім начыннем, маё цела ўжо не мае нічога, акрамя гэтай любові ўнутры. Грэх знікае як з'ява, бо для яго не застаецца месца. Знікае ў выніку той жа майтхуны, зліцця цела з Боскай любоўю, аддавання сябе целам Боскай волі.

Шун'ята, адкрытасць, вера – гэта адно і тое ж. Можна аддаць сябе з даверам хрысціянскаму Богу, усяму свету ці асобнаму чалавеку. Аддаванне свайго цела без страху – гэта акт веры. Аддаванне цела – значыць адмаўленне ад эга, размыццё межаў паміж сабой і іншымі "я", мной і ўсім, што існуе. Гэта акт разбурэння межаў, станаўлення бязмежным: станаўлення Богам. Гэта магчыма, калі цела зробіць свой свабодны, свядомы выбар і захоча стаць напоўненым начыннем, інструментам Вышэйшага. І тут розніцы ў падыходах паміж такімі, здаецца, рознымі сістэмамі, як хрысціянства і тантрызм, амаль няма.

## СРАВНИТЕЛЬНЫЙ АНАЛИЗ КОНЦЕПЦИЙ ТВОРЧЕСТВА Ф. НИЦШЕ И А. БЕРГСОНА

**Т. В. Дорощенок**

Проблема творчества не нуждается в доказательстве своей актуальности, поскольку значима для любого мыслящего человека. Особое звучание эта проблема приобретает в ситуации постмодернизма, где творчество исчезает одновременно с творящим субъектом. Для возможности переосмысления данной проблематики мы обращаемся к творчеству мыслителей, стоявших у истоков зарождения неклассического типа философствования и в огромной мере повлиявших как на философскую традицию, так и на художественную практику.